# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ГІСТОРЫІ СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ КРЫМІНАЛЬНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**С. А. Гур'еў**
*старшы выкладчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, кандыдат юрыдычных навук*
*Беларускі Дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя сістэматызаваныя заканадаўчыя акты ВКЛ крымінальна-прававога зместу. Адзначаецца пераемнасць у заканадаўчым замацаванні асобных крымінальна-прававых прынцыпаў і ідэй. Акрэслена тэндэнцыя да развіцця айчыннага сярэднявечнага крымінальнага заканадаўства ў сістэматызаванай форме.

В статье рассматриваются основные систематизированные законодательные акты ВКЛ уголовно-правового содержания. Отмечается преемственность в законодательном закреплении отдельных уголовно-правовых принципов и идей. Очерчена тенденция к развитию отечественного средневекового уголовного законодательства в систематизированной форме.

The article deals with the main systematized legislative criminal law content acts of the GDL. The continuity in the legislative consolidation of certain criminal law principles and ideas is noted. The tendency to the development of domestic medieval criminal legislation in a systematic form is outlined.

У другой палове XV ст. развіццё дзяржаўнасці ВКЛ дасягнула досыць высокага ўзроўню, адначасова ўзніклі перадумовы для ўскладнення і пашырэння разнастайнасці грамадскіх адносін, што мела вынікам узбуйненне заканадаўчага масіву, неабходнага для эфектыўнага рэгулявання праваадносін у дзяржаве. Павелічэнне колькасці і памеру сярэднявечных законаў, у сваю чаргу, патрабавала ўдасканалення і трансфармацыі тагачаснай юрыдычнай тэхнікі, у тым ліку і адносна галіны крымінальнага заканадаўства.

Так, адны з першых адносна маштабных агульнадзяржаўных спроб па ўзбуйненні заканадаўства былі ажыццёўлены ў Судзебніку Казіміра 1468 г. Адметнай рысай, характэрнай як для Судзебніка 1468 г., так і для наступных буйных збораў законаў ВКЛ, з'явілася тое, што ў дадзеных прававых актах рэгуляванне атрымалі адразу некалькі галін права. Напрыклад, акрамя крымінальна-прававой галіны Судзебнік Казіміра змяшчаў нормы, якія датычылі падатковага, адміністратыўнага, працэсуальнага і іншых заканадаўчых накірункаў, што для таго часу было значнай спробай удасканалення заканадаўчай тэхнікі.

Важным было тое, што ў Судзебніку 1468 г. знайшоў адлюстраванне інстытут аналогіі крымінальнага закона, былі здзейснены спробы вызначыць мэты пакарання, акрэсліць злачынства як супрацьпраўнае дзеянне і замацаваць некаторыя прагрэсіўныя крымінальна-прававыя прынцыпы (індывідуалізацыі пакарання, гуманізму і інш.).

Асноўныя палажэнні Судзебніка адносна мераў пакарання і ўзросту крымінальнай адказнасці былі значна дапрацаваны ў Статутах 1529, 1566 і 1588 гг. Можна сказаць, что Судзебнік 1468 г. у пэўнай ступені заклаў перадумовы для далейшай сістэматызацыі айчыннага заканадаўства, у тым ліку крымінальнага.

Варта адзначыць, што Судзебнік 1468 г. не быў падзелены на артыкулы, гэта тым больш падкрэслівае імклівы прагрэс айчыннага заканадаўцы ў сферы юрыдычнай тэхнікі, што адбыўся за тыя амаль 60 гадоў, якія акрэслілі перыяд паміж прыняццем Судзебніка 1468 г. і наступнага буйнога сістэматыванага акта - Статута 1529 г., бо апошні значна пераўзыходзіў свайго папярэдніка па якасці замацавання прававых палажэнняў.

Прыняцце Статута 1529 г. засведчыла сабой пераход айчыннай прававой думкі і заканадаўчай тэхнікі на якасна новы ўзровень. Айчынныя навукоўцы адмаўляюць Статутам ВКЛ, і Статуту 1529 г**.,** у прыватнасці, у статусе кодэкса з пункту гледжання сучаснага заканадаўчага вызначэння, што цалкам абгрунтавана [3, с. 15].

Тым не менш, некаторыя элементы кадыфікацыі ў гэтых актах усё ж прасочваюцца, бо, напрыклад, крымінальна-прававыя нормы ў статутах былі істотна перапрацаваны, абноўлены і выдзелены ў асобныя цэльныя і самастойныя раздзелы. Статуты ўтрымлівалі нормы, якія датычылі ўсіх відаў тагачасных злачынстваў і пакаранняў. Акрамя таго, у навуковай літаратуры таксама можна сустрэць абазначэнне Статута 1529 г. як “феадальнага кодэкса” [5].

Такім чынам, можна казаць аб зараджэнні ў сярэднявечным заканадаўстве ВКЛ пэўных кадыфікацыйных тэндэнцый, у тым ліку ў крымінальна-прававой галіне. Зважаючы на тое, што ў сапраўдны час айчыннае крымінальнае заканадаўства цалкам кадыфікавана, можна зрабіць выснову аб наяўнасці пэўнай гістарычнай пераемнасці ў падыходах да заканадаўчай тэхнікі і існаванні ўстойлівай і ў некаторай ступені гістарычна абумоўленай тэндэнцыі да кадыфікацыі крымінальнага заканадаўства.

Як адзначалася, Статут 1529 г. даў сімвалічны старт прыняццю серыі з трох статутаў XVI ст., з гэтай прычыны вельмі цяжка пераацаніць яго ролю ў гісторыі айчыннага заканадаўства,

крымінальнага ў тым ліку, таму разглядзім некалькі падрабязней яго асноўныя крымінальна-прававыя палажэнні.

Статут меў 13 раздзелаў, якія падзяляліся на артыкулы. Нормы крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага характару змяшчаліся ў асноўным ў раздзелах VII, XI - XIII

Аналіз зместа Статута 1529 г. дазваляе зрабіць выснову аб зараджэнні ў той час у ВКЛ прэзумпцыі невінаватасці, развіцці ідэй гуманізма, прынцыпаў недатыкальнасці асобы, адзінства права для ўсяго насельніцтва, індывідуалізацыі пакарання і інш.

Статутам 1529 г. быў прадугледжаны тэрмін крымінальнага пераследу ад 3 да 10 гадоў, у залежнасці ад цяжкасці злачынства. З арт. 7 р. І вынікае, што пакаранне магло быць прызначана толькі тым асобам, віна якіх была ўсталявана судом, такім чынам скасоўвалася калектыўная крымінальная адказнасць на карысць індывідуальнай. Акрамя таго, здзяйсненне злачынства больш не з’яўлялася падставай для таго, каб свабодная асоба пападала ў “вечнае рабства” (р. XI, арт. 6).

Статут 1529 г. вызначаў паняцце злачынства, яго віды ў залежнасці ад аб’екта крымінальна-прававой аховы (супраць дзяржавы, асобы, правасуддзя, маёмасці і інш.). Законам прадугледжвалася вельмі структураваная і дакладная сістэма пакаранняў, самым строгім з якіх з’яўлялася пазбаўленне жыцця і гонару. Пры гэтым, была ўсталявана сувымернасць пакарання цяжкасці здзейсненага злачынства (, р. 1, арт. 1).

Пры аналізе нормаў Статута 1529 г. прасочваецца досыць дакладная схема класіфікацыі складу злачынства праз вылучэнне злачынства, яго наступстваў і прычыннай сувязі паміж імі, выдзяляліся злачынствы, здзейсненыя групай асобаў ці індывідуальна, улічваўся матыў, віна, мэта ў здзейсненым злачынстве і інш.

Наступны Статут быў прыняты ў 1566 г. і шмат у чым развіў крымінальна-прававыя палажэнні папярэдняга Статута. Упершыню быў заканадаўча ўсталяваны ўзрост у 14 гадоў, з якога магла наступаць крымінальная адказнасць.

Асабліва важным было тое, што заканадаўца ўпершыню зрабіў спробу сфармуляваць палажэнне аб прэзумпцыі невінаватасці, хоць і тычылася гэта толькі саслоўя шляхты. Хоць у законе яшчэ не было выразна пазначана паняцце прэзумпцыі невінаватасці, аднак асноўная ідэя гэтага прынцыпу прасочваецца ў арт. 2, р. І, якая забараняе саджаць у астрог шляхціцаў на падставе даносу. У цэлым, у крымінальным праве знайшлі адлюстраванне новыя прагрэсіўныя ідэі і яно было больш лаяльным параўнальна з іншымі дзяржавамі. Напрыклад, абвяшчалася, што вольнага чалавека ні за якае злачынства нельга аддаваць у няволю,

што за злачынствы, учыненыя ў адносінах да жанчын, выплачваецца крымінальны штраф у двайным памеры і інш. [1].

Найбольш дасканалым з трох статутаў з’явіўся апошні Статут 1588 г., нормы якога замацавалі асноўныя крымінальна-прававыя прынцыпы, якія ў той ці іншай ступені знайшлі адлюстраванне ў пазнейшым заканадаўстве, у тым ліку замежным. Так, Статут 1588 г. змяшчаў новыя для тагачаснага крымінальнага права прынцыпы: роўнасці ўсіх свабодных людзей перад законам, адказнасці толькі ў судовым парадку, індывідуалізацыі пакарання («нихто иный ни за чый выступ и вчинок не был каран, тольки каждый сам за свой выступ маеть терпети и каран быти») [6].

Далейшае развіццё атрымала рэгламентацыя прэзумпцыі невінаватасці. Падкрэслівалася, што суд «в речах вонтпливых склоннейший маеть быти ку вызволенью нижли ку караныо» [7, с. 250].

Статут 1588 г. значна гуманізаваў крымінальнае права, напрыклад, тэрмін турэмнага зняволяння быў невялікі – да 1 года і 6 тыдняў. У параўнанні з папярэднім Статутам 1566 г. быў павялічаны да 16 гадоў узрост адказнасці непаўналетніх, смяротнае пакаранне не прымянялася да цяжарных жанчын, існавала ўзмоцненая крымінальна-прававая ахова жанчыны. Статут 1588 г. быў адным з першых заканадаўчых актаў Еўропы, крымінальныя нормы якога былі накіраваны на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў, іх рацыянальнае выкарыстанне [4, с. 241].

Статут 1588 г. вылучаў наўмысныя і ненаўмысныя злачынствы, цяжкія і меней цяжкія, распавядаў пра неабходную абарону, даваў вызначэнне саўдзельніцтву, паняццю злачынства, выдзяляў віды злачынстваў, апісваў склады злачынстваў, мэты і віды пакаранняў і інш.

Пры адсутнасці віны крымінальнае пакаранне па Статуту 1588 г. не прымянялася. Ненаўмысная віна ў шэрагу выпадкаў прадугледжвала толькі маёмасную адказнасць (пакрыццё страт, шкоды). Абавязкова вызначалася прычынная сувязь паміж дзеяннем і яго вынікам. Пры прызначэнні пакарання ўлічвалася псіхічнае становішча асобы, напрыклад, ад адказнасці вызваляліся «шалёныя і дурні» [2, с. 109]. Вызначаўся таксама тэрмін крымінальнай даўнасці ў 3 гады, па заканчэнні якога асоба не прыцягвалася да адказнасці [6].

Юрыдычная каштоўнасць Статута 1588 г. была настолькі значнай, што і пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ён заставаўся дзеючым законам (за выключэннем шэрагу артыкулаў) амаль да сярэдзіны XIX ст.

Нельга не ўзгадаць той відавочны факт, што беларускія землі займалі цэнтральнае месца ў ВКЛ, таму згаданыя сярэднявечныя законы

(Судзебнік 1468 г., Статуты 1529, 1566, 1588 гг.) у вялікай ступені з'яўляюцца прававой і культурнай спадчынай беларускага народу.

Заканамерна паўстае пытанне, чаму бурная праватворчая дзейнасць па сістэматызацыі айчыннага заканадаўства, характэрная для айчыннай гісторыі XVI ст., калі былі прыняты адразу тры статуты, была практычна спынена з прыняццем Статута 1588 г., бо за наступныя амаль 200 гадоў існавання ВКЛ больш не стварыла заканадаўчых актаў сувымернага маштабу.

Падаецца, што прычыны гэтага, па-першае, крыюцца ў складаных палітычных і сацыяльна-эканамічных абставінах, з якімі Княству давялося сутыкнуцца ў XVII – XVIII стст. Па-другое, можна сцвярджаць, што Статут 1588 г. у нечым нават апярэдзіў свой час, бо меў досыць высокі юрыдычны ўзровень і яго палажэнні былі дастатковымі для рэгулявання грамадскіх адносін у наступныя прыкладна 250 гадоў. Нават улады Расійскай Імперыі пасля далучэння беларускіх зямель дазвалялі карыстацца Статутам 1588 г. (за выключэннем асобных артыкулаў) яшчэ амаль паўвека, гэта азначае, што і ў XIX ст. палажэнні Статута 1588 г. працягвалі ў пэўнай ступені задавальняць патрэбам тагачаснага грамадства, чым яшчэ раз падкрэсліваецца высокі ўзровень айчыннага заканадаўства ў феадальны перыяд.

Падводзячы вынік адзначым, што пачынаючы з сярэдзіны XV ст. крымінальнае заканадаўства ВКЛ развівалася пераважна ў форме сістэматызацыі з пэўнымі элементамі кадыфікацыі, прычым у буйных заканадаўчых актах (Судзебнік 1468 г., Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.) побач з крымінальна-прававой галінай рэгуляваліся і іншыя прававыя сферы. Акрамя таго, для ўсіх айчынных зводаў законаў XV-XVI стст. былі характэрнымі пераемнасць у развіцці асноўных прававых прынцыпаў, ідэй і палажэнняў, у тым ліку і адносна галіны крымінальнага заканадаўства. Шматлікія крымінальна-прававыя палажэнні, замацаваныя ў трох статутах ВКЛ, былі даволі гуманнымі і прагрэсіўнымі для свайго часу. Статут 1588 г. увогуле з юрыдычнага пункту гледжання апынуўся настолькі дасканалым, што дзейнічаў каля двух з паловай стогоддзяў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Довнар Т.И. Значение и место Статута 1566 года в правовом развитии Великого Княжества Литовского // Аннали юридичної історії. Том 1. Номер 1, січень-березень 2017. С. 30 – 37.

2. Довнар Т.И. История государства и права Беларуси : учеб. пособие / Т. И. Довнар, Н. М. Юрашевич. Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2005. 317 с.

3. Дробязко С.Г. Юридическая природа Статута Великого княжества Литовского 1529 года. // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму (да 480-годдзя прыняцця) : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэд. Н. В. Баярава. Мінск, 2009. С. 15 – 17.

4. Крымінальнае права Беларусі: закон, злачынства, адказнасць : навуч. дапам. / А. У. Баркоў [і інш.] ; пад рэд. А. У. Баркова. Мінск : Завігар, 1997. 287 с.

5. Пичета В.И. Литовский статут 1529 г. и его источники // Статут Великого княжества Литовского 1529 г. / под ред. К. И. Яблонскиса. Минск, 1960. С. 15, 19, 21, 25.

6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на бел. мову А.С. Шагун – Мн.: Беларусь, 2005. — 207 с.

7. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : дапаможнік : у 2 ч. Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк. Беларус. дзярж. ун-та, 2000–2003. Т. 1. 2000. 349 с.